ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 19 (401) Нядзеля, 13 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена» Менск, Комсам. 2

АБ ПРАЦЫ ЦК ЛКСМБ.

Рэзолюцыя комсамольскай конфэрэнцыі Меншчыны

Заслухаўшы даклад тав. **Баранькіна** аб гадовай працы ЦК ЛКСМБ 3-я Менская акруговая конфэрэнцыя ЛКСМБ цалком ухваляе політычную лінію ЦК і яго практычную працу.

— Конфэрэнцыя з здаволенасьцю адзначае, што ЦК Комсамолу і ўвесь Комсамол Беларусі пад кіраўніцтвам партыі аднагалосна, усёй масай даў адпор выступленьням партыйнай опозыцыі.

Праводзячы правільную партлінію ва ўсёй сваёй працы, у выніку рашучага выступленьня супроць опозыцыі комсамол дасягнуў значных посьпехаў у павышэньні свайго ідэйнага ўзроўню і політычна загартаваўся.

Задача Комсамолу—замацаваць гэтыя посьпехі шляхам упартай працы па выкананьню пастаноў 15-й Усесаюзнай партконфэрэнцыі і рашэньняў 10-га зьезду КПБ.

— Конфэрэнцыя лічыць, што ЛКСМБ пад кіраўніцтвам свайго ЦК бязумоўна мае посьпехі ў справе ажыўленьня саюзнай працы. Характэрным зьяўляецца тое, што організацыя знаходзіцца на пераломе агульных размоў і агульнай пастаноўкі пытаньня аб неадпаведнасьці форм, мэтадаў і зьместу працы з растучымі запытаньнямі мас рабоча-сялянскай моладзі, да непасрэднай іх змычкі.

Гэта надцьвярджаецца дасягненьнямі: у галіне ўдзелу КСМ у гаспадарчым будаўніцтве; грамадзкай працы; агульным палепшэньнем экономічнага становішча рабочай моладзі; пашырэньнем агульна-эдукацыйнай працы; зрушэньню ў ажыўленьні культурна-масавай працы; пашырэньнем унутры-саюзнай дэмократыі і на гэтай падставе ўзмацненьне ўнутрысаюзнага кіраўніцтва, як кіраўніцтва конкрэтнага.

— Аднак, неадпаведнасьць паміж формамі, мэтодамі і зьместам працы Комсамолу і растучымі запытаньнямі мас рабоча-сялянскай моладзі яшчэ далёка ня зжыта. Такім чынам прыспасабленьне працы саюзу да гэтых запатрабаваньняў, увязка іх з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва, як і раней зьяўляецца цэнтральнаю проблемаю комсамольскага руху, як казаў 14-ты партзьезд.

— Конфэрэнцыя асабліва адзначае правільную пастаноўку задачы ЦК на працу ўсёй сваёй працы, аб удзеле КСМ у гаспадарчым будаўніцтве, як задачы стрыжнявай ва ўсёй практычнай працы саюзу. Конфэрэнцыя лічыць, што і ў далейшым такая пастаноўка пытаньня павінна быць захавана з паглыбленьнем яе ў бок яшчэ больш конкрэтнай пастаноўкі перад кожнай організацыяй і ячэйкай.

— Конфэрэнцыя адзначае ўзрастаючую грамадзка-політычную актыўнасьць рабоча-сялянскай моладзі на падставе гаспадарчага росту краіны і ўзмацненьня працы, якая праводзіцца партыяй і саюзам. Побач з гэтым маецца рост адмоўных зьявішчаў у масе асобных праслояў працоўнай моладзі: п'янства, хуліганства, некаторыя працівапастаўленьні асабістых інтарэсаў—грамадзкім, выцякаючых у асноўным з супярэчнасьцяй нашага пераходнага пэрыоду (беспрацоўе, бяспрытульнасьць, абсалютны рост уласна-капіталістычных элемэнтаў, новыя пласты рабочай моладзі з вытворчасьці).

Задачы КСМ: скарыстаць растучую грамадзка-політычную актыўнасьць моладзі і весьці барацьбу з ростам адмоўных зьявішчаў: шляхам уцягваньня моладзі ва ўсе віды конкрэтнай працы соцыялістычнага будаўніцтва.

Неабходна, як важнейшую задачу паставіць—аб разьвіцьці культурна-масавай працы, накіраванай на перабудаўніцтва быту рабоча-сялянскай моладзі, поўнасьцю увязваючы гэтую задачу з працаю па політычнаму выхаваньню мас рабоча-сялянскай моладзі, кіруючыся рашэньнямі 14-га партзьезду.

Конфэрэнцыя адзначае здаровае, у агульным, вывучэньне комсамолам існасьці нацыянальнай політыкі партыі, цьвёрды курс ЦК на ўсе організацыі на яе практычнаму правядзеньню ў жыцьцё і часткова у пытаньнях беларусізацыі.

У наступным пры захаваньні адзначанага цьвердага курсу кіраўніцтва асаблівую ўвагу ўдзяліць павышэньню ўдзелу КСМ у працы культурнага будаўніцтва БССР і ўзмацненьня працы па надрыхтоўцы кадраў маладой пролетарскай інтэлігэнцыі.

Адзначаючы ўзмацненьне пролетарскага кіраўніцтва ўнутры КСМ на аснове ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва працаю саюзу, вылучэньня рабочага актыву, павялічэньня партыйнага ядра, ў агульным здаровага росту КСМБ конфэрэнцыя лічыць, што асаблівую ўвагу ў замацаваньні паказаных дасягненьняў у умовах Беларусі павінна мець задача па павышэньню ўдзельнай політычнай вагі рабочай моладзі, гэта ёсьць яе актывізацыя павышэньня ідэйнага і культурнага яе ўзроўню.

— У весцы ўзмацняючы працу КСМ у сельсаветах, асаблівую ўвагу ўдзяліць працы сярод беднаты і батрацтва, задачы актывізацыі гэтых соцыяльных груп моладзі.

Паставіць на конкрэтную распрацоўку пытаньне аб ўдзеле КСМ у коопэратыўным будаўніцтве.

— У далейшым росьце саюзу строга кіравацца апошнімі пастановамі оргбюро ЦК УсеКП аб росьце КСМ.

— Ва ўсёй экономічнай працы на першае месца паставіць пытаньні адукацыйнай працы моладзі, яе вытворчага навучэньня. Пры чым, уся экономпраца павінна строіцца як можна больш масава.

— Адзначаючы цяжкае становішча піонэрорганізацыі ў сэнсе зьместу яе працы, ЦК павінен прыняць усе захады да яе палепшэньня і ажыўленьня. Конфэрэнцыя лічыць неабходным уцягнуць у працу вывучэньне хворых зьявішчаў у жыцьці піонэрорганізацыі і іх зьнішчэньню, у дапамогу піонэрактыву, увесь саюзны актыў.

— ЦК павінен у бліжэйшым будучым заняцца самым дасканальным вывучэньнем экономічнага становішча рабочай моладзі на транспарце і ўзмацненьнем кіраўніцтва працаю ў гэтай галіне.

— Неабходна ўзмацніць з боку ЦК праверку скарыстаньня мясцовымі організацыямі матар'ялаў аб масавай працы, якія зьмяшчаюцца ў комсамольскім друку.

— Неабходна больш рашучае прысаваньне газэты «Чырвоная Зьмена» да абслугоўваньня мас рабочай сялянскай моладзі і даць адбітку на яе старонках вопыту конкрэтнай справы ў організацыі.

— Неабходна ўзмацніць кіраўніцтва ЦК на аснове праверкі работы мясцовых організацый, у галіне ваенізацыі. Узмацніць увагу да высоўваньня асобных конкрэтных відаў працы па ваенізацыі—(вінтоўка, граната, працівагаз і г. д.). Работу па ваенізацыі мас моладзі увязаць з неабходнасьцю ўзмацненьня працы па разьвіцьцю фізычнай культуры.

— Нарэшце конфэрэнцыя зьвяртае ўвагу Менскай організацыі і ЦК на неабходнасьць узмацненьня ўвагі да пытаньняў міжнародных здарэньняў, асабліва здарэньням у Польшчы, Заходняй Беларусі і растлумачваньня характару падзей шырокім масам рабоча-сялянскай моладзі.

Кітаі новая грамадзянская вайна

КАНТОНЦЫ ПАРВАЛІ ПЕРАГАВОРЫ з АНГЕЛЬЦАМІ

Кантонская армія перамагае войскі Сун-Чуан-Фана

Ангельскае войска бунтуецца

Два батальёны высланы назад з Кітаю

Большая частка войска, пасланага Англіяй у Кітай, накіравана з яе калёніі Індыі. Індускія часьці навербаваны пераважна з ваяўнічага індускага племяньня сікхаў.

Аднак, гэтымі днямі сярод сікхаў, якія высадзіліся нядаўна ў Шанхаі, ангельская ўлада выкрыла буйную рэволюцыйную організацыю. Сярод салдат і засталі афіцэраў-індусаў былі члены партыі індускае нацыянальна-рэволюцыйнае партыі, якая змагаецца за вызваленьне Індыі ад ангельскага панаваньня. Гэтыя салдаты вялі ўзмоцненую агітацыю, угаварваючы сваіх таварышоў пераходзіць на бок кітайскага рэволюцыйнага ўраду і супольна з ім змагацца супроць Англіі.

Агітацыя мела вялікі посьпех. 2 батальёны, сярод якіх ўплыў агітатараў быў асабліва моцны, адасланы назад у Індыю. 15 афіцэраў і 40 салдат аддадзены у рукі вайсковага суду.

Прэч яснавельможных паноў!

„...Яўрэям, Чэхам і Сакратаром парт'ячэек уваход забаронены"

ПУАНКАРЭ КАХАЕ „ВАСЕНЬНІЯ НОЧЫ"

Сход гакенкрэйцлераў (фашыстых).

„Яўрэям, Чэхам і Сакратаром парт'ячэек уваход строга забаронены".

Нядаўна у Чэха-Славакіі у горадзе Мафэрсдорфэ адбываўся адчынены сход гакенкрэйцлераў (фашыстых).

На дзьвярах будынку, дзе адбываўся сход, была вывешана аб'ява:

Яўрэям, Чэхам і Сакратаром парт.-ячэек уваход строга забаронены.

На сход зьявілася 200 чалавек моладзі, з якіх $^2/_3$ складалі комсамольцы і спачуваючыя. Гакенкрэйцлеры таксама выклікалі сваіх старонынікаў з Габлонца. Аднак, ня гледзячы на гэтае падмацаваньне, гэты сход быў правалены; ен паслужыў яркім наказацелем таго, што фашысцкі рух ніякае сымпатыі заваяваць ня сумеў.

Рэчы абоіх прамоўцаў з Гакенкрэйца, якія хвалілі «магутны, моцны» фашысцкі рух, вызвалі агульны сьмех і астроты. Вялікае ўзбурэньне вызвала прысутнасьць на сходзе прадстаўніка ураду.

Нашы комсамольцы, выступіўшы з адказнаю прамоваю, ясна выкрылі існасьць фашысцкіх організацый.

Фашыстыя убачыўшы, што справа дрэнная, паднялі шум і крык.

Прадстаўнік ураду скарыстаў гэты выпадак для зачыненьня няўдачнага сходу. Гэты факт кажа за тое, што Чэшскі саюз карыстаецца у рабочай моладзі аўторытэтам. Саюз налічвае каля 14.000 сяброў.

Масы чеха-Славацкай рабочай моладзі упэўніліся, што адзіным надзейным іх кіраўнікам зьяўляецца толькі КСМ моладзі.

Вл. Рубін.

Пуанкарэ...*) піша вершы.

Ён кахае „васеньнія ночы".

— «Вы пытаеце, чаму
Так кахаю я васеньнія ночы?»

Адкуль гэта?

З дрэненькага «цыганскага» романсу?

Або з вершу нікому невядомага «любіцеля».

Не, не. Аўтар вершу, адкуль ўзяты гэтыя радкі,—славутасьць. Праўда, у сваёй галіне,—у галіне організацыі міжнародных боек і фашысцкіх соцень.

Аўтар гэтых вершаў—наш стары знаёмы,—Пуанкарэ.

Чало францускага ураду і былы француcкі прэзыдэнт, за кім засталася на заўсёды клічка «Пуанкарэ—вайна», піша, бачыце, вершы. І такія адчувальныя, хупазачэпныя!

«Вы пытаеце чаму
Так кахаю я васеньнія ночы,
Сумны, бедны час,
Калі кожны сядзіць у сябе»

Так піша Пуанкарэ у томе выданых сваіх вершаў.

Што-ж, гэта, можа і праўдзіва.

Кожны сядзіць у сябе,—
таму, што разам дзейнічаць Пуанкарэ, Чэмбэрлену і Мусаліні ніяк не ўдаецца.

«Ты кахаеш мяне,
Мне казала ты...
Але цесна нам тут,—
Хадзем разам на вольную паветру».

Але-ж куды выйсьці разам? У Кітай? Але-ж... позна. Кітай ужо прачнуўся,—так пішуць ня поэты, а... францускія газэты. Тут пакахаеш ціханька «сядзець у сябе». Асабліва калі у казёнай скрыньцы пуста.

Б.

*) Пуанкарэ—галоўны міністр Францыі.

Барацьба японскіх дзяцей

(Ліст з Японіі, атрыманы Менскім эспэрантыстым)

Адзінай організацыі пролетарскіх дзяцей ў нас няма. Японскі урад не дазваляе яе ствараць,—затое існаваньне груп бой-скаўтаў дазволіла і дзяржава ўсяляк дапамагае гэтаму руху.

А дзеці рабочых і сялян мучацца на фабрыках і вёсках пад прыгнётам цяжкай эксплёатацыі буржуазіі і паноў.

У лютым 1926 году адбылася вялікая стычка паміж буйным землеўласьнікам і сялянамі ў губэрніі Майгата.

Іх барацьба цягнулася 4 месяцы. Многія сяляне былі кінуты ў турму, многія малады барацьбіты былі забіты паліцэйскімі. Сёстры і маткі таварышоў, якія удзельнічалі у дэмонстрацыях, падлягалі жорсткай расправе фашыстых, наймітых панамі.

Але пасьля гэтага рух Майгацкага сялянства павялічыўся яшчэ больш, і ў канцы канцоў дзеці 600 змагаючыхся сялян пакінулі хадзіць у школу і далучыліся да дэмонстрацыі сваіх бацькоў.

А сяляне замест таго, каб пасылаць сваіх дзяцей у школы паноў, захавалі ў лесе сваю школу.

Настаўнікаў у яе выбралі з масы лепшых барацьбітоў рабочых і сялянскіх саюзаў.

У верасьні месяцы 1925 году у горадзе Іонага таксама адбылася вялікая дэмонстрацыя сялян за права карыстаньня зямлёю. Да гэтай дэмонстрацыі далучылася 5000 дзяцей, з якіх многія былі зьбіты паліцыяй.

На зваротным шляху 16 дзяўчат былі атакованы групай гарадзкіх бой-скаўтаў і зьбіты палкамі.

Але рабоча-сялянскія дзеці Японіі ідуць дружна ўперад, сьмела прадаўжаючы барацьбу разам з сваімі бацькамі.

КАДЗІВА ТАА.

Дэкларацыя кантонскага ўраду.

У абвешчанай дэкларацыі нацыянальнага ураду гаворыцца: «Нясупынная концэнтрацыя ангельскіх ваенных сіл у Шанхаі ня можа разглядацца нацыянальным урадам іначай, як акт прымусу, накіраваны супроць кітайскага нацыянальнага руху. Надпісаньне згоды ў гэтых умовах было-б роўналежна падпісаньню яе пад націскам сілы, і гэткая згода ня была-б рэальнаю і сапраўднаю. Нацыянальны ўрад прымушаны выждаць пакуль скончыцца гэты пэрыод націску, раней чымся даць поўнамоцтвы на надпісаньне якое-б та ні было згоды.

Супроць зьдзекаў пілсудчыны!

На прадвыбарным сходзе моладзі па пытаньні перавыбараў сельсаветаў вёскі Макановічы, Рэчыцкай акругі, Васілевіцкага раёну—быў заслуханы даклад аб становішчы Заходняй Беларусі. На сходзе прысутнічала звыш 100 чалавек моладзі і дарослых. Сход прыняў рэзолюцыю, у якой рашуча пратэстуе і ганьбіць урад Пілсудзкага. На разгул фашызму, сход пастанавіў адказаць яднаньнем навокал КПБ і КСМ па будаўніцтву савецкай гаспадаркі, таксама актыўным удзелам ячэйкі ОСА і ячэйкі МОПР'а, якой ня было да гэтага часу. Сход пастанавіў організаваць такавую, вылучыўшы камісію для збору ахвяраваньняў на карысьць зьняволеных у польскіх турмах. Таксама ў рэзолюцыі пастанавілі актыўна ўдзельнічаць у перавыбарах і падтрымліваць блёк бедняка з серадняком. Усе гэтыя пастановы на наступны дзень былі цалкам выкананы.

Цяцерынская дача.

У поэме Якуба КОЛАСА «Новая Зямля» палясоўшчык Міхал гаворыць свайму пану:

«—Чаго, пан, гэтак раскрычаўся?
Завошта, пан, мяне так лае?
Згарыць яна нахай, такая
І служба гэта, і пасада,
І гэта крыўда, і гэта здрада,
І гэта панская адплата!
Няхай яна будзе праклята!!!»

Палясоўшчык Міхал адважыўся гэта сказаць таму, што крыўда і здрада былі вельмі вялікія. Цяжкая і няўздачная панская служба схапіла Міхала за горла і ён, задыхаючыся, ня мог ня выбрасіць гэтых горкіх слоў бясьсільнага протэсту.

Тысячы Міхалаў жылі ў беларускіх лясох, берaглі панскую маемасьць, пакорна несьлі цяжар службы, а ў нявыказных думках марылі аб сваім кавалку зямлі, аб тым кавалку «новай зямлі» які-б аслабаніў іх ад пана...

Сярод гэтых людзей знаходзіліся і такія, якія ўваходзілі ў даверра пана, рабіліся вернымі яго слугамі, апускаліся да здрадніцтва рэволюцыйных сялян, гралі гнюсную ролю провакатараў і шпікаў...

Такім быў палясоўшчык Цяцерынскай дачы (Аршаншчына) **Паўла Бабкоў.**

У былыя гады ён і сын яго Улас верна служылі пану Данілевічу. Паўлу ня прыходзілася, як Коласаўскаму Міхалу, крыўдзіцца на «панскую адплату».

Панская адплата была вельмі добрая і нядарма: палясоўшчык Цяцерынскай дачы старанна паведамляў пану Данілевічу аб усіх сялянскіх непарадках, аб усіх «бунтовщиках и подозрительных людях». Сяляне вёскі Ліхінічы з агідаю глядзелі на Бабкова, але маўчалі: панскі бізун вісеў над галавамі.

У 1905 годзе, калі трывожна гудзелі і качаліся лясы і глуха хваляваліся вёскі, Паўлу Бабкову прышлося многа «папрацаваць»... У Ліхінічы кожны тыдзень прыяжджалі з павету, нечакана арыштоўвалі мужыкоў, вязалі рукі, узвальвалі на драбіны і ўвазілі... Дарэмна праразьліва і шалёна крычалі бабы, дарэмна хадзілі ў павет і губэрнію зморанывя, сухія старыкі. Многіх мужыкоў схавалі ў шэрую турму, многіх паслалі на ссылку ў далёкую, невядомую Сібір...

1917 год зьмеў і пана і палясоўшчыка з насіджаных месц.

Толькі ў 1922 годзе Бабкоў зноў аб'явіўся, змог «прымазацца» да Савецкай улады і заняць старое месца. Але ў 1925 годзе яго зьнялі з-за хабарніцтва і п'янства.

Цяпер палясоўшчыкам Цяцерынскай дачы служыць комсамолец Маляванаў. Маляванава ведаюць, як чэснага і стараннага хлапца. Маляванаў з юнацкім энтузыязмам узяўся на новую працу. Маляванаву цяжка, але ён цяжкасьцяй ня пужаецца.

Але ў лясох Цяцерынскай дачы ходзіць Паўла Бабкоў... Паўла Бабкоў ня можа згадзіцца з тым, што яго пасаду займае якісьці «смаркаты комсамолец».

Стары палясоўшчык разносіць усюды плёткі аб тым, што ў Маляванава быццам-бы раскрадваюць лес, што комсамолец дрэнна выконвае свае абавязкі... Бабкоў нават сабірае подпісы пад заяву аб тым, што Маляванава трэба зьняць са службы.

У той час, калі нагляданьне за працай палясоўшчыка ўваходзіць у абавязкі аб'езчыка, на Цяцерынскай дачы гэта выконваюць якіясьці цёмныя асобы. Вакол новага палясоўшчыка ўтвараецца нясьцерпная атмосфэра.

Недарма Бабкоў атрымаў «кваліфікацыю» ў старыя часы! Яго веды ў вобласьці шпіёнажу і даносу, у вобласьці хлусьні і плётак яму зноў прыгадзіліся! Бабкоў спадзяецца ўгадзіць Савецкай уладзе такім-жа чынам, як ён угаджаў пану Данілевічу.

Мы не абараняем Маляванава толькі таму, што ён комсамолец. Калі Маляванаў сапраўды дрэнна выконвае свае абавязкі—яго трэба зьняць.

Але мы супроць таго становішча, якое склалася цяпер на Цяцерынскай дачы. Супроць таго, што праверка работы дзяржаўных служачых пераходзіць чамусьці ў рукі такіх асоб, як Бабкоў. Мы ведаем што ад хлусьні і плётак недалёка да здрадніцкага стрэлу з-за рогу. Такая разьвязка лясной драмы вельмі магчыма і яе трэба папярэдзіць.

Міх. Гольдбэрг.

Не падкачаем на працы!

Наш удзел у саветах трэба замацаваць конкрэтнай працай.

Замацуем дасягненьні далейшай працай.

(Горкі, Аршанская акруга).

У буйных ячэйках быў прапрацаваны даклад тав. Молатава на пленуме ЦК УсеКП аб выніках перавыбараў савету. Таксама некаторыя ячэйкі прапрацоўвалі інструкцыю аб перавыбарах.

На сходаѣ ячэек былі заслуханы справаздачы комсамольцаў-сельсаветчыкаў. 2-3 ячэйкі практыкавалі пастаноўку справаздач сельсавету на культднях сялянскай моладзі.

Параўнаўча з мінулым годам комсамольцаў абрана ў сельсаветы значна больш. Летась мы мелі 28 комсамольцаў-сельсаветчыкаў, а сёлета—48. 6 комсамольцаў абраны старшынямі,5—сакратарамі.

У большасьці вёсак комсамольцы высоўваліся ў сельсаветы сходамі бедняты і праходзілі большасьцю галасоў. На перавыбарах ячэйкі выступалі організавана.

Трэба сказаць, што наша організацыя мае вялікія дасягненьні ў перавыбарах сельсавету. Гэтыя дасягненьні трэба замацаваць далейшай упартай працай комсамольцаў-сельсаветчыкаў.

МІКОЛА ГОРАЦКІ.

Добра падрыхтаваліся-- добра і перавыбіралі

(Сьмілавіцкі раён, Меншчына)

На агульных сходах ячэек была прапрацована інструкцыя ЦВК аб перавыбарах у саветы і пастанова пленуму ЦК і ЦКК УсеКП аб працы партыі ў саветах.

У мястэчку быў організован знарочысты вечар ячэек КСМ сумесна з рабочай моладзьдзю, прысьвечаны перавыбарам мястачковага нацыянальнага савету.

Так сама ў мястэчку адбылася дэмонстрацыя піонэраў з перавыбарнымі плякатамі і лёзунгамі. Дэмонстрацыя прыва біла да сябе шырокую ўвагу насельніцтва.

Як вынік гэтага мы маем некаторае павышэньне колькасьці комсамольцаў у саветах.

Напрыклад, у мінулым годзе мястачковы савет налічваў у сваім складзе сяброў і кандыдатаў савету—2 комсамольцы, цяпер—4.

У Драчкоўскім сельсавеце намесьнікам старшыні савету абрана дзяўчына-комсамолка **Лукашэвіч.**

Два комсамольцы выбраны старшынямі Карзуноўск. і Перэжырск. с-с. **Вымянец.**

Жаданьні забіякі спатыкнуліся

(Макановіцкі, савет, Васілевіцкі раён, Рэчыцкае акруга)

Перавыбары нашага сельсавету закончаны. У дэпутаты прашлі кандыдатуры, якія намячаліся на сходах і групах бедната. Выбрана 3 комсамольцы сябрамі сельсавету, 2—у рэўкамісію. Раней у гэтым сельсавеце ня было ніводнага партыйца і комсамольца. Таксама выбраны 3 жанчыны, якіх раней у савеце ня было.

Саюз бедняка з серадняком у часе выбараў адчуваўся на кожным кроку. Самаю актыўнаю часткаю выбаршчыкаў былі з аднаго боку комсамольцы і наогул моладзь, сябры профсаюзу, у асаблівасьці чыгуначнікі і бедната. Асабліва былі актыўнымі жанчыны, якія рашуча абаранялі кандыдатуры выстаўленыя ад фракцыі КП(б)Б і груп бедната.

З другога боку—частка заможніх на чале з старшынёй управы мясцовага спажывецкага таварыства Забіяка—чалавек з цёмнай мінуўшчынай, афіцэр старой арміі, сын кулака, бацька мае паравы млын і пазбаўлены права голасу. Яшчэ прымалі ўдзел некаторыя моцныя серадзякі і поп.

З старога складу сельсавету ня быў выбран ні адзін.

Новаму сельсавету, які ў большасьці складаецца з беднякоў, трэба будзе яшчэ больш згуртаваць беднату вакол свае працы.

Максім Трубецкі.

Конкрэтны ўдзел.

(Лепельскі раён, Барысаўская акруга).

У агульным організацыя ўдзельнічала ў перавыбарнай кампаніі актыўна. У некаторых мясцох **(Стаі, Мацюшына-Сьцяна)** па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі моладзь організавана з вечарынкі пад гукі гармоніку прыходзіла на перавыбарчы сход. Кандыдатуры, якія высоўваліся комсамольскімі ячэйкамі ці сходам моладзі, у большасьці выбіраліся. У вёсцы Юркава-Сьцяна з 5 сяброў сельсавету—4 комсамольцы, якія выбраны аднагалосна. У складзе Стайскага сельсавету **27 процантаў комсамольцаў.**

У Ляхавіцкім сельсавеце-у большасьці выбарчых вучасткаў усе кандыдатуры высоўваліся комсамольскімі ячэйкамі і амаль што ўсе праходзілі на выбарчых сходах. У склад гэтага сельсавету абрана 5 комсамольцаў, з іх комсамолка **Зінькевіч** выбрана сакратаром савету. Старшынёй польскага нацсельсавету (Весялоўскага) пераважнай большасьцю галасоў абраны комсамолец **Кажарскі.**

Апрача добрых бакоў былі і дрэнныя. Напрыклад, у вёсцы Ворань к перавыбарам добра падрыхтаваліся самагоншчыкі, хуліганы, «былыя людзі», якія задаліся мэтай скінуць старшыню Вораньскага сельсавету тав. Ляха. **А ў вёсцы Забор'е адзін комсамолец высоўваў і падтрымоўваў кандыдатуру кулака.**

Ня гледзячы на асобныя недахопы перавыбарчая кампанія паказала, што аўторытэт організацыі сярод сялянства павялічыўся, організаванасьць ячэек узмацнілася.

Па раёну выбрана комсамольцаў: сябрамі сельсаветаў—32, кандыдатамі — 10, сябрамі рэўкамісі — 3. З іх 3 старшыні сельсавету, 4 намесьнікамі і 5 сакратарамі.

Меяровіч.



Досуг і тэхнічныя навыкі.

Абгаварваем артыкул Крыжа.

Скарыстаем: бацькоў піонэраў, у якасьці кіраўнікоў тэхнічн[ых] гурткоў і памяшканьні школ для пазашкольн[ай] працы.

По пытаньням закранутым М. Кражам—у рэдакцыю паступіла шм[ат] допісаў, частку з іх сеньня мы зьмяшчаем. Рэдакцыя просіць яшчэ р[аз], каб таварышы больш высьвятлялі вопыт сваёй працы, дасягненьні ў [гэ]тым напрамку.

Па закранутых пытаньнях рэдакцыя склікае 19-га лютага асобн[ую] нараду ў горадзе Менску?

Бацькі піонэраў--кіраўнікі гурткоў

(Бабруйшчына).

Пытаньне паляпшэньня зьместу піонэр-працы і набыцьця піонэрамі тэхнічных ведаў, паднятая у «Чырвонай Зьмене» тав. Крыжам, зьяўляецца ў гэты час момантам, які патрабуе прыняцьця шэрагу практычных мерапрыемств.

Адным з гэтых мерапрыемств будзе зьяўляцца ўцягненьне бацькоў піонэраў у піонэрскую працу.

Праведзеная гарадзкая конфэрэнцыя бацькоў піонэраў у Бабруйску, дзе абгаварвалася гэтае пытаньне, паказала, што пры стварэньні належнай думкі, вакол гэтага пытаньня ў грамадзкіх організацыях і сярод бацькоў, можа многа дапамагчы ў далейшай працы ня толькі ў адносінах набыцьця піонэрамі тэхнічных ведаў, але і дапамагчы ва ўсёй піонэрскай працы.

Практычна, як гэта можна зрабіць.

Трэба кожнаму атраду пэрыодычна склікаць нарады бацькоў, сумесна з старэйшымі піонэрамі, для абгаварваньня практычных мерапрыемств у працы атрадаў і вырашэньня практычнай працы бацькоў ва ўмовах гэтага атраду.

Напрыклад: ёсьць мацеры, ці бацькі спэцы па тым ці іншым справам і на [та]кіх нарадах можна конкрэтна дагавар[ыц]ца, і дaручыць яму кіраваць тым ці [ін]шым гуртком.

У Бабруйскай акрузе ўжо ёсьць гу[рт]кі, як рукадзельля, шыцьця і г. д., [я]кімі кіруюць мацеры піонэраў.

Для вучоту ўсёй тэхнічнай прац[ы і] падняцьця грамадзкай думкі навакол [гэ]тага пытаньня, Бабруйскі АК ЛКСМБ [пра]водзіць Акруговую выстаўку тэхгуртк[оў] якая, па маей думцы, дасьць многа [ц]цікавага.

Найман.



Трэба выкарыстаць школу!

(Мястэчка Сьмілавічы, Меншчына).

Я зусім згодзен з думкаю тых таварышоў, якія раяць організоўваць розныя гурткі пры школе, хаце-чытальні і г. д.

Усё гэта можна зрабіць толькі ў горадзе, у мястэчку, дзе ёсьць досыць добрых школ, хат-чытальняў і іншых памяшканьняў.

У вясковых атрадах гэтыя самыя гурткі, як мастацкі, пераплётны, рукадзельле організоўваюцца, але зьяўляюцца няжыцьцёвымі з тэй прычыны, што няма належнага памяшканьня.

Кожны атрад мае недалёка ад сябе, а нават і ў тэй самай вёсцы школу, у якой і да гэтага часу не праводзіцца ніякая праца.

Акрамя правядзеньня гутарак, у атрады трэба ўліць хвалю вясёласьці, каб жыцьцё піонэраў было разнастойнае.

У горадзе можна наладжваць экскурсыі па розным галінам жыцьця і працы, але гэтага ў вясковых атрадах зрабіць нельга. Тут ня знойдзеш кіно, тэа[тра], фабрыкі, дык трэба больш адводзіць [часу] на гульні, песьні і г. д. Калі можна [у] весьці экскурсыю, дык гэта ў сельса[вет], у бліжэйшы саўхоз комуну, арцель, [але гэ]то не ўва ўсіх мясцох.

Дрэнна абстаіць справа ў вяско[вых] атрадах і з піонэрскай літаратурай, [прак]тычна яе амаль зусім няма. А літар[ату]ра таксама дапамагла-б добраму выка[ры]станьню вольнай гадзіны піонэра.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць [на] ўвядзеньне ў атрадах працы па зад[ан]ням наўперад распрацаваўшы іх на [на]радах, сэмінарыях і колектывах. Мне [зда]ецца, што гэта дало досыць добрыя [вы]нікі.

Толькі такім чынам мы зможам [зжы]ць усе хворыя зьявішчы ў працы [на]шай піонэрскай організацыі.

М. Процьк[і]

Пры кім існуюць гурткі?

(Асіповічы, Бабруйшчына).

Пытаньне, якое ў сваім артыкуле зачапіў Краж у сучасны момант павінна быць адным з галоўных пытаньняў піонэрскай працы.

Ня так даўно, у восень, піонэрскі актыў быў заняты вынаходжаньнем новых мэтодаў працы. У свой час былі скліканы розныя нарады піонэрпрацаўнікоў на гэтаму пытаньню, але пастановы іх на мясцох не праводзіліся. Напрыклад: у Асіповічах такая нарада парылася, парылася, а атрады працуюць і да гэтага часу па старому.

Правільна т. Краж зазначае аб набыцьці тэхнічных ведаў піонэрамі. Ён прапануе організоўваць розныя тэхнічныя гурткі пры школах, хатах-чытальнях, але толькі не пры атрадах. Я лічу, што гэта ня правільна і нават немагчыма.

Атрымліваецца гэта з тэй прычыны, што настаўнікі па загаду Району акрамя школьных занятказ не дазваляюць нават і вучням праводзіць у ёй тую ці іншую па-зашкольную працу. Вось гэта зьяўляецца адной з галоўных перашкод у правядзеньні піонэрскай працы.

Пры умовах нашай працы, асабліва у вясковых атрадах неабходна ўдзяліць і належны час на досуг піонэраў. Часта павадыры атрадаў і асобныя піонэрпрацаўнікі скардзяцца на тое, што ўжо форма піонэрпрацы ўстаралая і яе трэба мяняць. Але колькі не давай новых форм гэтай працы, яны заўсёды, праз месяц, будуць старымі. Гэта выходзіць з таго, што наш піонэрпрацаўнік не прымае пад увагу запатрабаваньняў дзяцей, а толькі і ведае, што праводзіць палітычныя гутаркі якія, часам, не ўлазяць у дзіцячы розум. Усё гэта даводзіць да таго, што некаторыя піонэры пакідаюць атрад кажучы, што «ён мне нічога не дае».

Піонэрскі атрад зьяўляецца асноўнай адзінкай піонэрорганізацыі. Калі мы зацікаўлены ў паляпшэньні яго працы і росту, дык павінны рабіць усё магчы[мае] дзеля таго, каб прыцягнуць усю вяско[вую] дзетвару да атраду, павінны распа[ўсю]джваць піонэрскі ўплыў на астатніх [дзя]цей. Калі-ж гурткі будуць пры хатах-[чы]тальнях дык іх трэба ўжо называц[ь не] піонэрскімі, а дзіцячымі наогул. Т[ады] гурткі будуць закрываць атрад. З[усім] іншы малюнак будзе, калі організоў[ваць] гурткі пры атрадах. Будзе ідав[ацца] расьці значэньне атраду і бацькі, ба[чачы] карысную працу ў атрадзе, пераме[няць] свой погляд на піонэраў.

Далей, у артыкуле гаворыцца [а]б зьнішчэньні розных назваў зьвен[яў]. Памаему там дзе магчыма апра[ўдаць] назву зьвяна, дык няхай яна заста[нецца]. Але я думаю, што ня страшна буд[зе зу]сім распусьціць зьвеньні і замест і[х ар]ганізаваць гурткі па якіх разьмерка[ваць] усіх піонэраў.

Што датычыцца організацыі д[о]піонэраў дык я згодзен з т. М. Кра[жам]. Гэтыя прапановы жыцьцёвыя, але [іх] выкананьне патрабуецца шмат часу.

Насьценную газэту ў атрад[зе] мысьлю выдаваць па чарзе кожным [зьвя]ном. Гэты вопыт быў праведзены ў [...]повіцкім атрадзе № 11, які сябе апра[вдаў] поўнасьцю. Удзел піонэраў у газэц[е] вялічваецца.

Міхась Вярнікоўс[кі]



Як працаваў Менскі акругком ЛКСМ?

З ваенізацыяй—ні тпру-ніну.—Ці патрэбны экономкамісіі пры райкомах? — Неабходна ўважлівей адносіцца да „броні“. —Протэкцыянізму—рашучая барацьба!

(На акруговай комсамольскай конфэрэнцыі)

Пустое месца.

Тав. Казанаў.—Калі мы і наладзілі сатаварыства, так гэта толькі зьяўляецца сатаварыствам, ці спайкай грамадзянскіх з вайсковымі комсамольцамі, але ў адносінах ваенізацыі—мы маем шмат недахопаў.

Тав. Капралоў.— Вайсковай працы мала зьвярталася ўвагі. Тут ёсьць частка віны і вайсковых хлапцоў. Вылучана вайсковая камісія, а яе сябры ніводнага разу не зьбіраліся.

Як ідзе экономпраца.

Тав. Каган.—Мэдыцінскі агляд рабочай моладзі паказаў, што здароўе рабочай моладзі кепскае, ня гледзячы на тое, што процант паляпшэньня узрос. Трэба працу нашых гурткоў фізкультуры паставіць лепш. Вучнёўства ў прыватных майстэрнях саматужнікаў адзіночак, знаходзіцца ў дрэнным становішчы, яно не атрымлівае дзеля сябе карысьці ў сэнсе сваёй кваліфікацыі. Тры гады таму назад АК распрацоўваў програмы па абучэньню вучнёўства, але гэтыя програмы да некаторых прадпрыемстваў не прыстасаваны.

Т. Валіцкі.—Да дасягненьняў экономічнай працы належыць аднесьці ўзмацненьне вытворчых нарад. Прыём «броні» ідзе нормальна. Але недахопаў хапае. Экономпраца не дастаткова пранікнула ў нізы організацыі. Нарады часта праваліваюцца,

Прадстаўнікі у ЦП саюзаў амаль што зусім не зьвяртаюць увагі на працу па Менакрузе.

Райэкономкамісіі ня жыцьцёвы, ня кіруюць працай ячэек; трэба іх ліквідаваць перадаўшы кіраўніцтва непасрэдна бюро райкому.

Т. Глезэр.—Здароўе будаўнічай моладзі не палепшылася, а пагоршылася. Экономпраца паслабла. Экономкамісіі трэба ўзварыць, а не ліквідаваць, бо гэта ўзмацніць кіраўніцтва экономпрацай ячэек.

Т. Каласоўскі. – Наша бронь у саўхозах абвучаецца кепса, ёсьць выпадкі неправідловага яе скарыстаньня.

Т. Вымянец.—Кіраўніцтва з боку АК экономпрацай, галоўным чынам, на вёсцы —няма.

Броні у саўхозах няма, калі часам ёсьць, то вельмі часта гэтым «рабятам» па 30-40 год. Трэба дабіцца большага прыёму моладзі ў арцелі.

Т. Мялешка.--АК ніякай працы не праводзіў на транспарце, а там справы ня зусім добрыя. У МШВ вытворчая дысцыпліна кепская, есьць нездавальненьне адміністрацыяй, хлапцы здаюць пробу, а адміністрацыя ў вышэйшыя разрады не пераводзіць. Ёсьць прагулы, вучні не наведваюць сходаў.

Т. Гельфанд. —У экономпрацы АК ёсьць шэраг дасягненьняў і мы ўжо маем частку спэцаў-комсамольцаў. Але гэтыя спэцы, галоўным чынам, вышлі з індывідуальнага і брыгаднага вучнёўства і вельмі мала з профшкол. Недахопам профшкол зьяўляецца кепскі набор вучняў на профэсыям, недастатковая падрыхтоўка моладзі. У профшколах малы тэрмін вывучэньня і трэба ці павялічыць тэрмін ці зьменьшыць програму. Кепскім зьяўляецца ўхіл моладзі да зьдзельшчыны.

Гэта тлумачыцца тым, што зарплата моладзі адстала ад зарплаты дарослых рабочых.

Бронь у нас запоўнена толькі на 45-50 проц. Трэба аслабаніць перараосткаў з броні і запоўніць поўнасьцю бронь.

У ўмовах Беларусі трэба ўтварыць звыш бронь, каб ня трымаць моладзь на ўтрыманьні страхкасы. Трэба ўстанавіць норму прыёму на вытворчасьць дзяцей рабочых.

Тав. Рудніцкая.—Вучнёўства на шклозаводзе настаўлена дрэнна. У сувязі з рэжымам экономіі моладзь «прыжымаюць», а адгэтуль зацяжка ў абучэньні і перарослі. Я супроць прыняцьця на завод дзяцей рабочых. Гэта перашкаджае вывучэньню вучняў прынятых праз біржу працы і будзе разгортваць протэкцыянізм.

Тав. Aроцкер (завод «Чырв. Зорка»).—Ячэйкі пры харчовых заводах паставілі сабе задачу даць моладзі дастатковую кваліфікацыю, але вучні ня могуць працаваць, не стараюцца і ўрэшце прыходзіцца заставацца чорнарабочымі.

Ёсьць бронь, якая зусім лішняя, і падлеткі кваліфікацыі ад яе ніякай не атрымаюць. У харчовай прамысловасьці магчыма організацыя профшколы.

Тав. Пасюкоў.—Цяга вясковай моладзі ў горад тлумачыцца дзьвюма прычынамі: першае—кепскім матар'яльным становішчам моладзі, і падругое—кулацкая моладзь добра забясьпечаная цягнецца ў горад дзеля таго, каб добра пажыць. Я вам дам прыклад адносін комсамольцаў да магчымасьці атрымаць працу у сябе на раёне. У нас пачалі працаваць тарфяныя распрацоўкі, Райком меў магчымасьць паслаць туды комсамольцаў, адміністрацыя не адказвалася іх прымаць і без Райкому, але з комсамольцаў ніхто туды працаваць не пашоў, хаця аплата была добрая. Беспрацоўныя комсамольцы ня зьняўшыся з вучоту ў РК, едуць ў горад.

Тав. Шпок.—Па статыстычных ведах 60 проц. хворай моладзі на транспарце. «Дамы адпачынку» амаль што нічога не даюць ў сэнсе паляпшаньня здароўя. Возьмем конкрэтны прыклад, школа ФЗВ—ня так даўно абгледжаны—60 проц. хворых. т. Мялешка выступаючы абараняў школу МШВ МББ, але на справе ў зьявішчах у школе вінаваты самі вучні.

Яны вінаваты, што самакіраваньне настаўлена дрэнна кепскія ўзаемаадносіны з адміністрацыяй.

Я лічу, што таксама мае заганы праца адносна батрацкай моладзі, працу гэту неабходна паставіць на належную вышыню.

* * *

Пасьля заключнай прамовы т. Шалімы конфэрэнцыя абрала камісію для апрацоўкі рэзолюцыі па дакладу АК.

Вытрымкі з гэтай рэзолюцыі будуць надрукованы ў чарговым нумары.

СТАРОНКА ЛІТАРАТУРЫ І КРЫТЫКІ.

Янка Бобрык

Ганула

(з кнізкі «Заходняя Беларусь»)

I

...ькі я прымружу вочы і, перада мной
...дарога... шлях і вузкая сьцяжынка
...а сьцяжынках: сьлёзы, зьдзек паноў...
... полі, цемені стаіць дзяўчынка.
...іць яна, прасьцёршы рукі ў даль,
...зальбой: за што, за што забралі бацьку...
...брат мой брат жыцьцё даўно аддаў
...трожным сьценам замку.
...на, адна я засталася,
... каласок пасьля жніва.
... слова цёплага, ні ласкі,
... бедная, мая-ж ты галава...

II

...ытуліўся дзень да ночы;
...вы ціха, ціханька шапочуць.
...ькі дзеўчыне Ганулі прытуліся там дзе хочаш.
... сваю я галаву,
... схілю сягоньня...
... на зелену траву,
...мо' на загоне.
... на зеленай траве,
...мо на загоне—
...чэй будзе на душы,
... я ня ў прыгоне.
...ч. Шуміць сасоньнік.
...разьняк гамоніць—
...калосьсе гнецца долу на жытнёвых гонях
...ля рэчкі звонка-струнная
...вы ўжо заснулі...
... купальле больш ня пусьціць, больш вянкоў Ганулі...

* * *

...сэрцы крыўда на душы так горка...
...схрыстаю асірацелай хата на сяле—
...льш ня прытуліць ня прыгорне—
...брата любага, ні бацьку, ні мяне...
Бывайце родныя
бывайце дарагія...
Я адплачу за кроў браты!
У лясох сваіх лепш хай загіну
перад сьвітаньнем залатым.

АЛЕСЬ ЗВОНАК.

Адзьвінеўшае.

Заўважаю з сумам: час праходзіць,
Я бліжэй штачасна к сінім берагам...
Можа скажуць скора,
Можа скажуць—годзе!
Можа я напомню
Сам аб гэтым вам.

Сёньня-ж я спакойны, як ніколі.
Ня крычу ў трывозе, як крычаў парой
І ня точыць сэрца,
І ня точыць болем,
І у жылах болей
Ня бунтуе кроў...

Гляну я навокал зрокам ясным:
Ня шуміць зімой скаваная Дзьвіна...
І ня трэба хмелю,
І ня трэба «шчасьця»—
Можа яго кубак
Выпіты да дна...

Неяк сёньня радасна і дзіўна...
Весела ступаю ўпругаю нагой...
Ня шумяць прасторы,
Ня шуміць Наддзьвіньне,
Толькі звоняць бомы
У срэбраных сьнягох...

* * *

Есьць такое слова дарагое.
Я яго сягоньня ўспомніў, як праз сон,
Што бяз хмелю хмеліць,
Што кружыць галовы,
І што паліць у сэрцы
І ў крыві агонь...

Мне яго сказала палачанка,
Калі дні шумелі цьвеценьню садоў
Чорнымі брывамі,
Чорнымі вачамі,
Апаліўшы сэрца,
Запаліўшы кроў...

* * *

... Гэта ўсё мінула—больш ня прыдзе
Дзе ступалі ногі—пад сьнегам трава...
Можа троху сумна,
Можа троху ў крыўдзе,
Можа больш ня хочу
У сьвеце вандраваць...

Менскі—ўчора, сёньня—палачанін...
Мне адна радзіма—край савецкі мой.
Краю мой бялявы,
Краю мой каханы,
З хмурнаю усьмешкай
Прыдарожных хвой!..

І чаму так радасна і дзіўна?
Быццам-бы трывогі шумна праплылі..
І стаю ў раздум'і,
І стаю адзін я...
А зямля сьнягамі
Белымі пыліць...

Полацк.

М. Хведаровіч.

Лясная музыка.

Шалясьценьнем лісьцяў цёмны лес гаворыць,
Крохамі пшанічнымі ападаюць зоры.
Вецер звонкі, звонкі, найчысьцейшы чысты,
Надпявае ціхаму шалясьценьнею лісьцяў.

Ціха надпявае песенькі-заранкі
А на небасхіле месяц абаранкам.
Пакаціўся ў поле, пакаціўся ў долы,
За бярэзьнік белы, за бярэзьнік голы.

Зацьвілі надзеі, заснавалі мары,
Закрануў я струны, абудзіў гітару.
Дарагая бліжай, прытуліся бліжай,
Бачыш языкамі нехта неба ліжа.

Нехта аграбае асалоду жменяй
І ўзыходзяць сонца ясныя праменьні.
А бярэзьнік белы, а бярэзьнік голы
Атрасае сьлёзы ў белыя падолы.

Супакойся любая, прытуліся бліжай,
Бачыш на ядловец нехта зоры ніжа.
Прыхіліся бліжай, бліжай прыхіліся,
Паглядзі бярозка з клёнам абняліся.

І здаецца сёньня так бліскуча росна
У цябе суніцы замест палкіх вуснаў.
Прытуліся бліжай, прытуліся блізка.
Будзе пацалункаў залатая нізка!



Я. ПАНАМАРОЎ.

Я ўспомніў ліпень.

Зашумела жыта ў полі каласамі,
Я ўспомніў ліпень, на мяжы быльнёг.
Заліваўся ў лесе салавей часамі,
У прастор блакітны ціха вечар лёг.

Я ўспомніў ліпень, той начлежны гоман,
Водырам напоена начанька была.
У цішы вячэрняй зазьвінелі бомы,
Лёгенькай плянёнкай ўсё туман заслаў.

У цішы вячэрняй зазьвінелі бомы,
Пераліўнай песьняй звонкіх галасоў.
Спачываюць хлопцы ад дняўное стомы,
Між палос дрымотных, жытніх каласоў.

Зашумела жыта ў полі каласамі,
Я ўспомніў ліпень, на мяжы быльнёг.
Заліваўся ў лесе салавей часамі
У прастор блакітны ціхі вечар лёг.

Зьм. Астапенка.

* * *

Вечарам росным
Стройныя сосны
Ціха шапталі,
Штосьці шумелі...
Песьні лящелі
У сінія далі.

Вокал-жа марай
Спалі абшары
У белым тумане...
У марах і белі
Сосны зьвінелі
Там на паляне.

Песьні віліся
У цьмяныя высі,
Там прападалі...
Далі і зоры,
Струн пераборы
У іх сунадалі.

Вечарам росным
Стройныя сосны
Ціха шапталі...
Ціха віліся
Пад шорахі лісьця
Думкі ў каралі...

А. РОЗНА

* * *

Я выходжу на вуліцу сьцежкай
Новы дзень сустракае мяне.
Сонца сьвеціць у далі бязьмежнай,
Шле вітаньне шумлівай вясьне.

Бо сягоньня дзень вольны і новы,
Бо другая пара надышла.
Льюцца новага гымну словы,
Гымну дзён маладога жыцьця.

Я выходжу сьцежкай на вуліцу
Сонца кідае зірк мне ўсьлед.
Тополь наш к старой хаце туліцца
Сонца льле прамяністы свой сьвет.

Жыцьцё новае нас сустракае
Загарыцца комуны зара,
Мільгаціць, мільгаціць ня сьціхае,
Звонкім гулам над намі вясна.



Літаратурная хроніка

— Пісьменьнік Кузьма Чорны здаў у друк апавяданьне «Зямля».

— Поэта Т. Жылка падрыхтаваў да друку зборнік вершаў.

Вагні далёкае краіны.

Вагні далёкае краіны
Пазалацілі наш цягнік.
У вечнасьць крыўдаў шлях пазьнік,
Як сьлёзы ў попеле руінаў.
Над намі зоры пэрламутрам
Рассыпалі свой срэбны сьвет.
Пад громы навальніц, завей
Кладзём жыцьцю сталёвы мы падмурак.

Вакол і звон, і енк, і грук!..
Мы стомлены—ня чуем рук!
Ды сэрцам вольным, маладым
Гарым адвагаю пілётаў,

Бо верым шчыра ў нагароду
За шлях крыві байцоў сьляды.

Алесь Якімовіч.

Бібліографія

„Маладняк" штомесячная літаратурна-мастацкая і грамадзка-палітычная часопісь. Студзень 1927 г.

«Маладняк», які раней быў ня зусім масавай і мала распаўсюджанай часопісьсю, зараз пастаўлен у такія ўмовы, якія дазваляюць спадзявацца, што тыраж яго будзе няўхільна расьці.

Гэтымі ўмовамі зьяўляюцца: гарантаваны штомесячны выхад часопісі і магчымасьць пры падпісцы на «Чырвоную Зьмену» атрымаць «Маладняк» за даплату 35 кап., замест 60 к.

Перад намі першы спытак часопісі за гэты год. Простая, але прыгожая вокладка, ясны і выразны шрыфт, за нязначнымі выключэньнямі ўдалы зьмест, робяць добрае ўражаньне. На першай старонцы зьмешчан сьпіс супрацаўнікоў, які сьведчыць, што навакол часопісі згуртаваны ўсё больш менш значныя літаратурныя і грамадзкія імёны.

Амаль палову ўсяго нумару займае літаратурны аддзел, дзе зьмешчаны вершы поэтаў і ў першую чаргу маладнякоўцаў. Вершы (усяго іх 14) малююцца галоўным чынам індывідуальныя перажываньні і настроі песьняроў.

Возьмем, напрыклад, вельмі характэрны верш В. Маракова «Была восень». Пасьля «пялёсткаў», ад якіх у шмат якіх чытачоў засталося сумнае і цяжкае ўражаньне, (бо аўтар даходзіў там нават да ідэі самагубства), Маракоў прыпадносіць нам новы прасякнуты шчырасьцю і бадзёрасьцю верш, які сьведчыць, што настрой поэты зьмяніўся к лепшаму.

З астатніх, адзначаюцца вершы М. Чарота, Александровіча, А. Гурло.

Трэба адзначыць апавяданьне Галавача «Дзьве сьцежкі». Тэма-Разладзьдзе ў сям'і і барацьба старога з новым, распрацавана ім даволі ўдала.

Артыкул Астаповіча «Другі бок мэдалі» закранае досыць злабадзённае пытаньне: аб матар'яльным становішчы нашага пісьменьніцкага маладняка. Тэма сама па сабе вёльмі цікавая і як трэба было чакаць, друкуецца ў дыскусыйным парадку. На жаль аўтар артыкулу абмяжаваўся пераліченьнем фактаў і не зрабіў аніякіх вывадаў.

«Маладняк» не адрываецца і ад грамадзкага жыцьця. У гэтым нумары зьмешчаны артыкулы аб асновах савецкай дзяржавы, аб працы комсамолу і г. д.

Аддзел бібліографіі ня можа здаволіць чытача. Усе зьмешчаныя тут рэцэнзіі акрамя аднэй, прысьвечаны якімсьці-та ня масавым і ня популярным расійскім выданьням. Пажадана-б было тут бачыць водгукі на апошнія кніжныя навіны нашай беларускай літаратуры.

Наогул-жа, першы спытак «Маладняка», дае шмат цікавага матар'ялу і можа быць рэкомэндаваны шырокім колам чытачоў.

Я. З.

Частушкі.

(На матыў „Провады")

К перавыбарам прашла—
Падрыхтоўка,
Цяпер выбары ідуць
Жыва, лоўка.
З сельсавету паляціць
Кулачына,
Працаваць у ім пачне,
Ды жанчына.
А каго-ж мы правядем?
— Ой батрачак,
А таксама ўцягнем
Сераднячак
Што жанчына чалавек—
Нам вядома,
Што працуе яна больш
Каля дому.
Комсамольская братва—
Незабудзься,
Прымай сувязь з бедняком—
З хаўрусуйся.
Ой, дабро будзе, дабро
У нас на сьвеце,
Бо працуюць бедняки
У савеце.

МЯЦЕЛІЦА СЬВЕДКАЙ БЫЛА

Апавяданьне з жыцьця Заходняй Беларусі.

Зьмітрака Гарошына.

—Ешчэ Польша ня згінэла,
Покі мы жыемы...
Паны любяць салаў'я...
Дваццаць дзевак адзін я!—

П'янымі дрыжачымі галасамі сьпявалі белапанскія лягіёны ў Мікітавай хаце.

Цупронка—чарнамазы вясковы гармоністы бесьперастанку цягаў сапсуты гармонік, мацней націскаў на спраўныя галасы, каб гэтым самым заглушыць хрып хворых.

Пакінуць іграць ему было нельга, бо разьюшаныя паны гатовы бізунамі спаласаваць яго сьпіну і прымусіць рабіць тое, што захочацца іх мосьцям.

Дзяўчат у хаце было з паўсотні.

П'яныя да ўпаду лягіёны абнімаліся з імі па кутках, працягвалі свае ванючыя морды да пацалункаў, да моцных адчуваньняў.

Мікітава хата была перапоўнена дзявочым піскам, пакутаваньнем гармоніку і форсам салдат пілсудзкай арміі...

— Кракове грай!..

— Нашу родную давай!.. Варшаўску...—даводзіў да злосьці Цупрона сваймі штохвілінными загадамі панскі паруччык Стась.

І Цупронка мусіў выконваць паруччыкавы загады, бо яго баяліся ня толькі вяскоўцы, а калаціліся ад яго зіркаў і тыя паны, што тут гулялі.

Стась карыстаючыся сваім становішчам, чынам, бліскучымі пагонамі і звонкімі шпорамі, як кажуць, кандзібобарам хадзіў прад дзяўчатамі, асабліва прад Аленкай Міхалёвай. Усе павінны былі яму весела ўхмыляцца, ніхто ня меў права супярэчыць панскаму распутніцтву, панскім выбрыкушкам.

Аленка сачыла за ўсім гэтым, успамінала ўчарашнія зьдзекі над ёй Стася, старалася затаіць сваё ненавіджаньне да панскіх сынкоў, быць вясёлай, але маладое гарачае сэрца падчынялася іншаму, слухала другую музыку, скакала другія скокі.

Аленка, калі заставалася адна адзінютка моцна плакала і адчувала, як разам з буйнымі кроплямі сьлёз спадалі далоў і кусочкі гаркаты, што душылі дзявочае сэрца.

Яна, як ніхто другі, ненавідзела панскіх служак, яна, як ніхто кахала Андрэйку—суседняга хлапца.

Бадай няма нічога гарчэй на сьвеце, як чужыя праціўныя кіпцюры, што адчуваючы сваю часовую моц упіваюцца ў клубок маладога каханьня, стараюцца яго разарваць, непатрэбнае адкінуць, а патрэбнае падначаліць сваім жаданьням.

Гэта адчуваў і Андрэй з Аленкай. Патайком сустракаючыся яны выкладалі свае душы, свае мары, яны ўпіваліся блізасьцю сваіх постацяў.

Але ў апошнія дні даведаўся пра такія спатканьні Аленкі Стась і папярэдзіў Андрэя, што калі гэта яшчэ раз паўторыцца—застрэліць, як падлу...

* * *

Андрэй з Аленкай пераносіць такія пакуты ўжо больш не маглі. Яны заўсёды шукалі шляхоў для вызваленьня свайго каханьня, для пазбаўленьня сябе ад «шчасьця» бачыць усе панскія зьдзекі над бацькамі, над сёстрамі і братамі.

Аднаго разу, калі Андрэй быў у гумне, да яго прыбегла Аленка і радасна прагаварыла:

— Знаеш, Андрэйка! Я нашла выхад... Украду ў Стася пісталет і абое... пастраляемся. Больш цярпець не магчыма!

Андрэй моцна прыхінуў да сябе заплаканую Аленку, пацалаваў яе ў вільготны твар і спакойна адказаў:

— Дурненькая, Аленка! Хіба можна ў такі час рабіць сабе сьмерць?! Хіба можна аб гэтым думаць сёньня, калі жыцьцё бушуе, як у буру мора. Ды хто ведае, што будзе заўтра.

— Калі ты чакаеш заўтрашняга, Андрэйка, дык чакай сабе адзін, а я сёньня-ж ноччу расстануся з жыцьцём.

— Дарагая Аленка, што ты? Хіба я мару застацца адзін?!

І моцны пацалунак прыгожага хлапца даў Аленцы магчымасьць адчуць прыгожасьць жыцьця, брыдкасьць сваіх замераў...

На расстаньні Аленка паведаміла свайго каханага:

— Сёньня, Андрэйка, мяне Стась прымушае ехаць у мястэчка на вечар. Як мне зрабіць?..

— Што, на вечар? Ох, белапольская качарга!

Аленка ўтаропілася ў сасновы бор, што чарнеў на на ўсходзе ад іх вёскі, а Андрэй глядзеў на яе і глыбока думаў.

Пасьля некаторага маўчаньня, Андрэй зьвярнуўся да Аленкі праз шопат:

— А ці ня скарыстаць нам гэты момант, Аленка, а?

Я ўвесь час думаю, каб не самім загінуць, а каб загубіць гэту сволач тваю!

Твары маладой дзяўчыны і хлапца блеснулі іскаркамі радасьці. Яны адышлі ад варот, прыселі на сані і пачалі аб нечым думаць.

— А знаеш, Аленка, што я думаю?—парваў маўчаньне Андрэй.—Нам трэба як будзеш ехаць ў мястэчка прыдушыць Стася, а самім драпануць ў Менск. Там такі-ж твой брат і сяк так пракідаемся.

Аленка не магла ўносіць сваіх паправак у плян Андрэя.

Пачало цямнець.

Вецер узмацніўся і моцна трубіў у коміны.

Мяцеліца туманам падымалася над хатамі, закрывала іх сьнежнаю коўдраю і злосна выла ў полі.

Андрэй цёпла і лёгка адзеўся, узяў у торбачку кусочак сала, хлеба, палажыў у кішэню наган і нічога не сказаўшы хатнім пашоў прыгуменьнямі ў пушчу...

Не ў забаве Стась з Аленкай ехалі па замеценай сьнегам дарозе. Аленка была вясёлай і сьвежай. Стась гэта тлумачыў дзявочым шчасьцем. Яна сама прыхінулася да яго твару, моцна пацалавала і схіліла яго галаву сабе на прыпол.

Паруччык гарэў радасьцю.

Аленка шчыкатала па яго шыі сваёй цёплаю ручкай.

Уехаўшы ў пушчу, Аленка не хацела давесьці жывым Стася да месца, дзе чакае іх Андрэй. Яна дастала з панчохі прыгатаваны востры нож, прыціснулася да паруччыка, яшчэ раз яго пацалавала, што зрабіла Стася п'яным ад дзявочага каханьня, адхінула ад шыі каўнер і старанна шарганула нажом па тонкай шыі.

Стась задрыгаў нагамі, захрапла ў горле кроў.

Аленка старанна пагнала каня і не заўважыла, як ускочыў на сані Андрэй і прыняўся душыць паруччыка.

Аленка апамяталася і папярэдзіла Андрэя аб тым, што Стась ужо [illegible] дзеў.

Сунялі каня...

Мёртвага паруччыка ра[illegible]
і кінулі ў горы пульхна[illegible]

Андрэй апрануўшы [illegible]
ўзяў лейцы ў рукі і [illegible]
стэчка.

Аленка ўся [illegible]
скарэй даехаць [illegible]
перапраўіцца [illegible]

А мяце[illegible]

Мяцелі[illegible]
каю гэр[illegible]

І м[illegible]
дараг[illegible]

Працягваць барацьбу з бяспрытульнасьцю.

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад цэнтральнай камісіі дапамогі бяспрытульным дзецям.

У прынятай пастанове прэзыдыум ЦВК прызнаў працу камісіі здавальняючай і прапанаваў ёй зрабіць захады да дасканальнага вывучэньня прычын і характару дзіцячай бяспрытульнасьці, уцягнуць у справу дапамогі бяспрытульным шырокія масы насельніцтва і ў прыватнасьці сялянства.

Піонэры выйдуць у лягер!

— Колегія Паркамату аховы здароўя зацьвердзіла выдаткі на організацыю ў бягучым годзе **цэнтральнага піонэрскага лягеру для вытворчых атрадаў БССР.**

Масавая профтэхасьвета.

Галоўпрофасьветы пастанавіў разьвіваць масавую профтэхнічную асьвету па БССР шляхам організацыі курсаў і гурткоў. Гэта праводзіцца ў зьвязку з немагчымасьцю ахапіць усіх жадаючых існуючаю сеткаю профтэхшкол і школ ФЗВ.

Чырвоныя тэхнікі

Наркамасьветы прыступіў да рэорганізацыі электра-мэханічнага тэхнікуму ў Віцебску, які дагэтуль выпушчаў тэхнікаў аднолькавай спэцыяльнасьці.

Рэорганізацыя прадугледжвае так званую «біфуркацыю»—разьбіўку студэнтаў тэхнікуму з 2-га курсу на шэраг асобных факультэтаў.

Гэтым будзе дасягнута падрыхтоўка да выпуску чырвоных тэхнікаў па розных галінах (электра-мэханічных).

Новая школа.

Адчынілася новая школа сялянскай моладзі ў Пераэжырскім сельсавеце Сьмілавіцкага раёну, у якую прынята 65 чалавек.

Сярод вучняў вялікі процант дзяўчат.

1--20 сакавіка.

Менская Гарадзкая Выбарчая Камісія распрацавала плян справаздачнай кампаніі Горсавету, якая распачнецца 17-га лютага.

Выбары ў Горсавет адбудуцца паміж 1 і 20 сакавіка.

Білецікі разыходзяцца!

Распаўсюджваньне лётарэйных білетаў на карысьць Авіяхіму ідзе вельмі пасьпешна.

Ужо атрымана з Масквы сьвежая партыя гэтых білетаў (30.000 шт.)

Апошнюю частку білетаў (10.000 шт) намечана распаўсюдзіць у працягу лютага.

Актыўны ўдзел у куплі білетаў прымаюць вясковыя ячэйкі Авіяхіму.

Пачатак розыгрышу лётарэі — 1-га ліпеня г. г.

Аб ўсім.

▣ Пры усіх пэдтэхнікумах БССР організаваліся консультацыйныя бюро, дзеля інструктаваньня настаўніцтва ў сэнсе самападрыхтоўкі.

▣ Выпуск перарасткаў з дзіцячых дамоў правядзе Наркамасьветы ў хуткім часе па ўсіх акругах.

▣ Літгрупа «Зьвеньня» прыступіла да выданьня шэрагу зборнікаў прозы і поэзіі.

Сёньня раньняшнім цягніком...

Сёньня раньняшнім цягнікам прыяжджаюць у Менск

вучні Койданаўскай школы сялянскай моладзі на экскурсію,

...нізаванаю рэдакцыяй «Чырво... ...ьмены» сумесна з Менскім ...кругкомам ЛКСМБ.

...будуць у Менску 1 дзень. ...ць музэй Рэволюцыі, ...зэй і электрычную ...цыю.

...тчаў будзе на... ...абед у комса... ...рам экскур... ...р, дзе бу... ...аль-Ван...

ПІОНЭРЫ ВЯЛІКАЙ СПРАВЫ.

Адчыненьне краязнаўчага зьезду.

10-га лютага распачаў сваю працу 2-гі ўсебеларускі краязнаўчы зьезд. Зьезд адчыніўся проста, без усякіх урачыстых прамоў і прывітаньняў і адразу прыступіў да практычнай працы.

Першым пытаньнем парадку дню стаяла справаздача Цэнтральнага Бюро Краязнаўства. Дакладчык па гэтаму пытаньню тав. **Казак** абмаляваў стан і разьвіцьцё краязнаўчай справы ў БССР.

Мэтамі краязнаўства—казаў дакладчык,—зьяўляецца ўсебаковае вывучэньне краю па гістарычнай, экономічнай і іншым галінам. Краязнаўчая справа набывае за апошні час вялікае значэньне, бо нельга будаваць соцыялізм у мала дасьледванай і кепска вывучанай краіне.

Нашы краязнаўчыя організацыі ўвесь час працавалі пад ідэёвым кіраўніцтвам компартыі. За год мы маем значныя дасягненьні. Значна павялічыўся лік сяброў краязнаўчых організацый: ён складае цяпер 7073. 9 процантаў з гэтага ліку—комсамольцы. Наогул трэба адзначыць што ўдзел моладзі ў краязнаўчай справе павялічыўся.

Структура краязнаўчых організацый гэткая: гурток, раённае таварыства акруговае таварыства і Цэнтральнае Бюро. Усе гэтыя організацыі займаюцца вывучэньнем адпаведнай тэрыторыі.

Далей тав. Казак спыніўся на працы праробленай краязнаўчымі організацыіямі. Па БССР заснавана 16 краязнаўчых музэяў, дзе маюцца розныя экспанаты, характарызуючыя даную мясцовасьць. Організацыі вялі досьлед розных галін сваёй тэрыторыі і прыслалі ў Інбелкульт шмат цікавых матар'ялаў і інш.

На гэтым-жа пасяджэньні быў заслуханы даклад т. Касьпяровіча аб дзейнасьці краязнаўчай сеткі БССР. З.

Запытаньні і адказы.

Запытаньне № 800 (В). Ці будзе мэтазгоднай пастанова бюро ячэйкі аб тым, каб газэты выпісваць не праз ячэйку, а кожным комсамольцам паасобку.

Адказ. Калі ячэйка знойдзе, што індывідуальная падпіска дасьць лепшыя вынікі, дык бязумоўна, трэба гэта зрабіць.

Запытаньне № 801 (Сьліва Я.). Колькі разоў у месяц выходзіць часопіс **«Беларускі Піонэр»** і колькі яна каштуе ў месяц?

Адказ. Часопіс з лютага месяца пачала выходзіць 2 разы ў месяц. Каштуе 15 кап. у месяц.

Запытаньне № 802 (Цёмкіна). Ці можа ячэйка без ведама савету выключыць піонэра з атраду?

Адказ. Яна гэта павінна зрабіць у паг оджанасьці з саветам.

У тры радкі.

Конкурс на лепшую ячэйку Чырвонага Крыжу БССР абвешчан на днях. Прэмію ЦК Чырв. Кр. вызначыў у 300 руб.

— Да сусьветнага дню работніцы (8 сакавіка) па 6 акругах БССР адчыняецца шэраг ясьляў і пляцовак.

— 1013 сельсаветаў перавыбрана дагэтуль па БССР. У склад іх з 15.411 сяброў ўвашло—1.598 комсамольцаў і 1678 комуністых.

— 320 вагонаў цукру вылучана для БССР «Сахартрэстам» і Белкоопсаюзам на пэрыод студзень-сакавік (супроць мінулага кварталу звыш на 105 ваг.)

— Лятучыя мітынгі протэсту супроць новых казьняў ў Літве адбыліся 8 лютага на буйнейшых прадпрыемствах Менску.

— Начлежныя дамы для беспрацоўных утвараюцца ў хуткім часе амаль ва ўсіх акруговых гарадох БССР.



ПРАЗ 3 ДНІ МЫ ІДЗЕМ НА 1-шы СПЭКТАКЛЬ:

Ці ўсе ячэйкі закупілі білеты?

За першыя 2 дні на масавыя спэктаклі для моладзі у Дзяржтэатры прададзена 300 білетаў. Білеты закупілі яч... В.С.П.Г., Нархарчаваньня, Белкоопсаюзу, зав. «Варшавянка», тэкстыльшчыкаў, друкароў, Меншвэй, школы гарбароў, вайско... група конардзіву, банкаўская і інш.

Білеты прадаюцца кожны дзень: днём у рэдакцыі «Чырвоная Зьмена» (Комсамольская, 25), а вечарам у клюбе «Кі... у тав. Ароцкера.

Таварыш урач--руку!

Што сказаў зьезд вучастковых урачоў.

Амаль цэлых 9 дзён працаваў зьезд. Усе 13 пытаньняў, якія стаялі на парадку дню, былі выслуханы і разабраны па косточках, з аднолькаваю ўвагаю і сур'ёзнасьцю.

«Зарадка» дадзеная зьездам у сваіх пастановах паслужыць фундамэнтам працы па ахове здароўя не на адзін і не на два гады.

150 дэлегатаў і амаль толькі-ж гасьцей выслухалі даклад аб задачах аховы здароўя дзяцей і падлеткаў. Нас, маладзь, у асаблівасьці цікавіць гэтае пытаньне. Па гэтаму дакладу выказаўся у спрэчках Наркам Аховы Здароўя тав. Барсукоў, які сказаў: калі Ахматмлад—вытворчая база жанаддзелу, дык у той-жа сьцежкі аддзел Аховы Здароўя Дзяцей—вытворчая база Комсамолу.

Якія важнейшыя пастановы зьезду па гэтаму пытаньню?

Трэба прыступіць да організацыі раённых дыспансэраў у выглядзе габінетаў фізкультуры і пэдалёгіі.

Маючыяся 4 дыспансэры дзяцей і падлеткаў у гарадох трэба давясьці да 12.

Вучастковы ўрач павінен бліжэй зьвязацца з ячэйкаю Комсамолу ў вёсцы.

Да кожнага вучастку павінны быць прымацаваны 10—15 школ для мэдыка-санітарнага абслугоўваньня.

Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на піонэр-рух і школы сялянскай моладзі

Фонд «1» (лячэбны фонд) недастаткова яшчэ да гэтага часу выкарыстоўваўся ў справе аховы здароўя дзяцей і падлеткаў. Неабходна вылучыць з гэтага фонду сродкі на аздаравіцельныя ўстановы для рабочай моладзі.

Усе гэтыя пастановы ня могуць прайсьці міма ўвагі працоўнай моладзі. Моладзь павінна аб іх ведаць.

Усё гэта практычныя задачы, патрабуючыя практычнага ўдзелу ў іх разьвязваньні ўсяго комсамолу.

Увесь зьезд прашоў пад лёзунгам практычных задач.

Комсамол даў абяцаньне зьезду дапамагчы ў правядзеньні гэтых задач у жыцьцё.

Брадоцкі.

БОЛЬШ ЛЯПСУСАЎ НЯ БУДЗЕ.

Белдзяржкіно адказвае.

У нумары 18 (400) «Чырвонай Зьмены» была зьмешчана замет... «Вялікія ідыёты» вытворчасьці Белдзяржкіно, ці чаму сумуе міст... Дройд», якая паказвала на тое, што беларускія надпісы ў кіно-фільм... выпуску Белдзяржкіно часта бываюць няпісьменныя. Белдзяржкіно ...чыць, што «Чырвоная Зьмена» вельмі правільна і своечасова зьвярну... ўвагу на гэтую недарэчнасьць.

Памылкі, якія заўважваліся ў беларускіх надпісах, дапушчаны п... ракладчыкам, дзякуючы таму, што надпісы перакладаліся з расійск... на беларускую мову да таго часу, як карціна праглядалася. Перакла... чык ня ведаючы зьместу карціны, часта ня мог зразумець да ча... адносяцца тыя ці іншыя словы і дапушчаў памылкі. Паміж іншым п... мылкі ў фільме «Г а м б у р г» былі вынікам таго, што расійскія на... пісы ў сцэнарыі (мантажы) былі надрукаваны вельмі неразборчыва.

Белдзяржкіно ўжо прыняла захады да спраўленьня памылак у кі... фільме «Г а м б у р г», а таксама і ў іншых стужках.

У будучым ляпсусы ў беларускіх надпісах ня будуць дапушчац...

Намесьнік загадчыка Белдзяржкіно КАЦНЭЛЬСОН.

ВУЛІЦА---ПРЫЕМНІК---ЗАВОД.



На здымцы—**Менскія бяспрытульныя.**

Збоку—бяспрытульны хлапец з вуліцы перад паступленьнем у прыемнік.

На версе—бяспрытульныя ў прыемніку за вучобай.

На карысьць Балтфлёту.

Менскі акругком ЛКСМ унёс у лік разьвёрсткі пленуму ЦК ЛКС... на карысьць Балтфлёту 100 руб. Астатнія грошы будуць унесены п... тыдзень.

ЗІМНІМ ВЕЧАРАМ ЗА ГРЫЎНЮ...

(На Менскім катку культаддзелу ЦСПСБ).

— Ох... хо... хо-ха-ха-ха... Ох... ха...

Сьмяецца целая група конькабежцаў.

— Ды чаго вы! Канёк «не тавос»—балтаецца...

Хлапец, які шлёпнуўся на лёд, саромячыся, ідзе шукаць канёк, які зарваўшыся з нагі паляцеў у ладыгі замерзшых кустоў. Праз некаторы час пацярпеўшы ідзе ў старожку.

— Дайце ключ—канькі скідваюцца!... Што?!—Няма! Ды я-ж грошы заплаціў!

Гэту атаку ў старожцы спатыкаюць вельмі спакойна.

— Можаце ўзяць канькі з чаравікамі. Гэта будзе каштаваць яшчэ 20 капеек.

— Ды я-ж у ботах, у мяне тут і пласьцінкі і ўсе... Як-жа я на галіфэ з кароткімі штанінамі буду адзяваць чаравікі?

Хлапец хвалюецца: канькі ўзяў, а прышрубаваць няма чым—ключа нехапае...

У старожцы з гумарыстычнай «снисходительностью» прапануюць:

— Калі ў вас і на самай справе няма чым прышрубаваць канькі—дык вы можаце ўзяць сані. Гэта ўсё адно, што канькі!

— К чорту... с...свол...ч...

Хлапец ідзе зноў на каток у надзеі ўкаго небудзь знайсьці ключык.

Адміністрацыя катка не магла паклапаціцца аб тым, каб у старожцы былі ўсякія прылады да зімовага спорту!



*

Усё-ж падобныя «пікантныя перапалкі» асабліва не перашкаджаюць агульнаму добраму настрою конькабежцаў.

Адміністрацыя таксама здаволена. Выручка—ня кепская.

Калі над сонным гарадзкім садам апушчаецца чорнае скрыдла вечару,—ля касы катку зьяўляецца чарга.

Успыхваюць на слупох ліхтары.

Кола катку невялікае. Даш два-тры моцных размахі і канькі спакойна прасьлізнуць амаль праз увесь віраж.

Каток паступова прымае выгляд бязутрымнага хуткага агульнага руху.

— Ух...х...х...

Марознае паветра ласкоча грудзі.

Ахапляе нейкая прыемная нэрвовасьць. Імкнешся перагнаць другіх. Так усе.

Але ўперадзе усіх усё-ж аказваюцца тыя, хто на нажах. Куды простай сьнягурачцы альбо амэрыканцы ўгнацца за доўгімі вострымі нажамі!

У працягу апошніх 3-х тыдняў каток культаддзелу ЦСПСБ прапусьціў 3 тысячы чалавек. У параўнаньні з мінулым годам наведваньне ўзрасло у 3 разы.

15-га і 16-га лютага на гэтым катку адбудзецца вялікі «карнавал на ільду». У карнавале прымуць удзел звыш 100 чалавек.

Ю. Каваль.

Адказныя рэдактары А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 23990. 2 Дзярждрукарня БДВ.